Пралетарыі ўсіх краёў, здучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая газэта

НЯДЗЕЛЯ
29 СТУДЗЕНЯ 1933 г.
№ 24 (3680)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказны рэдактар 769
Адказны сакратар 4-78
Сэкта.оў . . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (яна звяна)
Выдавецтва . . 2-44

АЎТАМАТЫ:
Адк. рэдактар . 20-831
Адк. сакратар . 22-161
Сэктары . . . 22-160
Кантора . . . 22-158

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і лістаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.
КОШТ АБ'ЯВЫ — 1 радок вонпаралі 1 руб. 50 к
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ — аб'ягубе 1 дакумэнта 2 руб.

Сеньня у нумары

ПЕРАДАВЫ—АРТЫКУЛ: Сацыялістычным палём—спраўны трактар.
Фарсаваць вывазку ўгнаеньняў.
АБ ВЫВАЗЦЫ МІНЭРАЛЬНАГА ЎГНАЕНЬНЯ, ВАПНЫ, ТОРФУ, ЗБОРУ І ХАВАНЬНЯ ПОПЕЛУ: пастанова ЦК КП(б)Б ад 25 студзеня 1933 г.
ЛЕНАЗАГАТОЎКІ: ліквідаваць адставаньне леназагатовак—баявая задача партарганізацый і саветаў Сіроцінскага, Мсьціслаўскага, Лепельскага, Асьвейскага і Бешанковіцкага раёнаў. (2 стар.).
На трэцяй сэсіі ЦВК СССР (1 стар.).
Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі азэт-арганізацыі. Пастанова ЦВК БССР (2 стар.).
ЗА ГРАНІЦАЙ (2 стар.).

Бальшавікі Менску ўхваляюць пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б

Рэзалюцыя пленуму Менгаркому, МенГКК КП(б)Б і менскага партактыву па дакладу тав. ГІКАЛО аб выніках аб'яднанага студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(

Сацыялістычным палём—спраўны трактар

У двух сваіх геніяльных прамовах на аполнім пленуме ЦК і ЦКК Усе КП(б), т. Сталін, падагульваючы вынікі буйнейшых перамог першай пяцігодкі сацыялістычнага будаўніцтва, даў выразны марксыцка-ленінскі аналіз пройдзенага этапу і разам з тым высунуў разгорнутую праграму далейшай барацьбы па завяршэньні сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Адным з важнейшых пунктаў гэтай праграмы, які асабліва выразна падкрэсьлены ў рашэньнях пленуму, зьчуляецца ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, аўладаньне тэхнікай буйнай сацыялістычнай вытворчасьці. У дачыненьні да сацыялістычнага земляробства гэта абазначае, што—галоўны ўпор зараз павінен быць зроблены... не на пашырэньні пасеўных плошчаў, а на рост ураджайнасьці ў земляробстве і палепшаньне якасьці работы ў сельскай гаспадарцы».

Выходзячы з гэтага, пленум устанавіў для 1933 году сярэдні разьмер ураджайнасьці з аднаго га, у прыватнасьці, па збожжавых— 8 цэнт. з га, па лёне—2,4 цэнт. з га.

Такім чынам, барацьба за падвышэньне прадукцыйнасьці працы ў сельскай гаспадарцы, уздым вытворчых сіл саўгасаў, МТС і калгасаў пастаўлены партыяй у парадак дню для практычнага іх вырашэньня ўжо ў першую вясну другой пяцігодкі .Адсюль паўстае задача, якая патрабуе разгорнутай падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы, пераклічэньня ўсіх сіл і сродкаў на барацьбу за ўраджай.

Выключная роля ў пасьпяховым вырашэньні праблемы ўраджайнасьці ўкладаецца на саўгасы і МТС. Іменна яны, (саўгасы і МТС),—гэтыя галоўныя вагары «перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад і бязупынкага ўзмацненьня савецкага ўплыву на калгасьнікаў, як буйнейшыя фабрыкі сацыялістычнага земляробства»—абязаны ўзначаліць барацьбу за ўраджай. Ня трэба забываць, што праблема ўраджайнасьці, перш за ўсё, патрабуе высока-якасной апрацоўкі зямлі і максымальна ўшчыльненых тэрмінаў раньняй сяўбы. Гэта ў сваю чаргу патрабуе своечасовага прывядзеньня ў баявую гатоўнасьць усіх рэсурсаў і галоўным чынам, падрыхтоўка важнейшых сродкаў вытворчасьці—трактараў і машын. МТС па сутнасьці ўжо ўступілі ў першы адказны этап падрыхтоўкі да сяўбы—прыступілі да дамонту трактарнага парку. Ад таго, у якім выглядзе выступіць у поле трактарны парк пасьля зімовага рамонту, у значнай меры будзе залежыць якасьць работы вытворчага вучастку МТС,што абумоўлівае вышыню калгаснага ўраджаю. Рамонт трактарнага парку не «тэхнічная справа». Рамонт трактарнага парку—гэта буйнейшая гаспадарча-палітычная кампанія, якая вынікае з цэнтральнай задачы—з праблемы барацьбы за ўраджай. Усякая недавшэнка рамонту павінна атрымаць рашучы адпор.

Мінулы сельска-гаспадарчы год павінен паслужыць суровым урокам для МТС, асабліва для тых МТС, якія мелі нізкаякасны рамонт трактароў і машын. Ці ўлічаны гэтыя ўрокі ў сёлетнюю рамонтную кампанію? Якімі тэмпамі працуюць і якой якасьці прадукцыю выпускаюць рамонтныя цэхі?

Сёлета рамонт трактароў у БССР сканцэнтраваны ў 16 майстэрнях, пераважная большасьць якіх знаходзіцца пры МТС, астатнія пры саўгасах і двух буйных заводах («Чырвоны барацьбіт», Гомсельмаш). Ня гледзячы на тое, што параўнальна з мінулым годам рамонт трактарнага парку пастаўлены ў лепшыя ўмовы, тэмпы і якасьць рамонту нездавальняючыя. На 25 студзеня з агульнай колькасьці трактароў, што падлягаюць рамонту 2773, адрамантавана 401, або 14,4 проц. Гэты нізкі процант выкананьня заданьня гаворыць, перш за ўсё аб злачынна безадказнай рабоце раду арганізацый, на якія непасрэдна ўскладзена кіраўніцтва рамонтам трактарнага парку.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 27 студзеня, падкрэсьліваючы пагражаючае становішча з рамонтам трактарнага парку, устанавіў, што «... з боку Трактарацэнтраў, дырэктароў МТС, саўгасаў, трэстаў і Белкапсаюзу не праведзена праверка трактароў і не ўстаноўлена ў якой ступені патрабуецца рамонт кожнага трактара, а так сама і запасных частак да іх».

Папярэджваючы аб недапушчальна павольных тэмпах рамонту трактарнага парку, ЦК разам з тым даў разгорнутую праграму практычных мерапрыемстваў, накіраваных на пасьпяховае правядзеньне рамонту. За ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў трэба змагацца з бальшавіцкай рашучасьцю.

Барацьба за здаровы трактар, за высокую якасьць рамонту, барацьба за аўладаньне машыннай тэхнікай, непарушна зьвязана з праблемай барацьбы за ўраджай. І таму малейшае ігнараваньне рамонту трактарнага парку павінна разглядацца, як праява апартунізму, у якія-б «аб'ектыўныя прычыны» падобнае ігнараваньне не спраналася. З гэтымі праявамі неабходна весьці самую рашучую барацьбу.

Неадкладная дастаўка трактароў на месцы рамонту, апэрацыйнае кіраўніцтва работай майстэрань, арганізацыйна-тэхнічны вытворчы інструктаж—павінны быць пастаўлены на баявыя рэйкі.

Асаблівую ўвагу—якасьці рамонту. Трактару патрэбен не абыякі рамонт, не такі рамонт, які меў месца ў радзе МТС летась, калі трактар выходзіў з баразны на трэцяя суткі пасьля рамонту. Такому «рамонту» трэба абвясьціць рашучую барацьбу. Трактару пасьля рамонту патрэбен такі рамонт, які-б перш за ўсё забясьпечыў нармальную, карысную работу трактара на ўвесь сэзон бяз усякіх перабояў. Трэба памятаць, што здаровы трактар у значнай ступені вырашае посьпехі раньняй сяўбы ў максымальна ўшчыльненым тэрміны. «Устанавіць, што за якасьць рамонту нясуць адказнасьць дырэктар МТС, дырэктар саўгасу і загадчык майстэрняў капітальнага рамонту» (з паст. ЦК КП(б)Б).

Рамонтная майстэрня павінна прыкаваць да сябе ўвагу ўсіх партыйных і прафэсіянальных арганізацый як горада, так і вёскі. Раённыя партыйныя арганізацыі і саветы абавязаны надаць максымальную ўвагу трактарнаму парку, памятаючы, што рамонтная кампанія—гэта першы адказнейшы этап барацьбы за сацыялістычны ўраджай. Спраўу рамонту трактарнага парку трэба абкружыць клопатамі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Іні цыятыва рабочых заводу імя Вара шылава аб арганізацыі вытворча-тэхнічнага шэфства над МТС і МТМ павінна ператварыцца ў масавы паход барацьбы за спраўны, своечасова і добраякасна адрамантаваны трактар.

Абязьлічка рамонту —асноўны біч прастоўя трактароў, які летась у радзе МТС дасягаў 40—50 проц. Задача партячэек і прафарганізацый МТМ і МТС—павесьці рашучую барацьбу супроць абязьлічкі рамонту трактарнага парку. Кожны адрамантаваны трактар павінен мець пашпарт, у якім было-б паказаны ня толькі адрас майстэрні, але і прозьвішча людзей, што рабілі рамонт.

«Устанавіць, як правіла, што трактар лічыцца адрамантаваным тады, калі падпісан акт здачы і прыёмкі загад чыкам майстэрні, а з заводам—загадчыкам цэху, старшым трактарыстам МТС, саўгасу, які прымае трактар і трактарыстам, які замацаваны для работы на гэтым трактары» (з паст. ЦК КП(б)Б).

Ад гэтага правіла ня трэба адступаць ні на крок.

Рамонтная кампанія праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Захоўваючы свой твар, кулаку часта ўдаецца пралезьці ў рамонтныя майстэрні. Тут ён (кулак) пачынае сваю падрыўную работу. Прагулы, абі боцтва, рвацтва, лятунства, простае шкодніцтва,—вось яны плады кулацкай падрыўной дзейнасьці.

Ачышчаючы МТМ і МТС ад кляса вага ворага і яго агентаў, мабілізуючы рабочую масу вакол рашэньняў пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) — партарганізацыі абавязаны забясьпечыць своечасовы і добраякасны рамонт трактарнага парку, выпусьціць з майстэрні на сацыялістычныя палі спраўны, без дэфэктаў трактар.

Пленум Менскага Гаркому і ГарКК сумесна з партактывам, заслухаўшы даклад тав. ГІКАЛО аб выніках аб'яднанага студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК, цалкам і поўнасьцю далучаюцца да рашэньняў пленуму.

Рашэньні студзеньскага пленуму, якія падводзяць вынікі гераічнай барацьбы партыі за выкананьне першай пяцігодкі, зьяўляюцца вялізарнейшай падзеяй сучаснай эпохі і з усёй выразнасьцю паказваюць гістарычную нягрунтоўнасьць і банкрутства сыстэмы сусьветнага капіталізму перад тварам непераможнай магутнасьці растучага сацыялізму.

Поўнасьцю вырашана асноўная задача першай пяцігодкі—стварэньня ўласнай перадавой тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. СССР з краіны аграрнай, залежачай ад капрызаў капіталістычных краін, ператворан у краіну індустрыяльную і магутную, упаўне самастойную і незалежачую ад капрызаў сусьветнага капіталізму, у краіну. здольную абараняць сацыялістычнае будаўніцтва ад усякіх нападак звонку.

На аснове гіганцкага росту індустрыі, снабжаючы сельскую гаспадарку трактарамі і новымі сельгасмашынамі, партыя дабілася аб'яднаньня дробных адпасобных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектыўныя гаспадаркі, пасьпяхова праводзячы на гэтай аснове палітыку ліквідацыі кулацтва, як класы.

«Рабочая кляса СССР. пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, пасьпяхова выканала асноўную задачу пяцігодкі—стварэньня ўласнай перадавой тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі».

Вялізарнейшай заваёвай рабочае кляскі і працоўнага сялянства ў краіне пераможнага сацыялізму зьяўляецца зьнішчэньне беспрацоўя і ліквідацыі няўпэўненасьці ў заўтрашнім дні сярод рабочых, ахоп калгасным будаўніцтвам амаль ўсёй беднаты і зьнішчэньне галечы і паўпэрызму ў вёсцы.

Перамогі пяцігодкі з ўсёй пераканаласьцю паказваюць усяму сусьветнаму пралетарыяту, працоўным і прыгнечаным усіх краін, што дыктатура пралетарыяту і савецкая сыстэма зьяўляюцца для іх адзіным шляхам вызваленьня ад голаду, беспрацоўя і жабрацтва.

Вялізарнейшых перамог першай пяцігодкі рабочая кляса СССР дасягнула пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, яе ленінскага ЦК на чале з правадыром і настаўнікам партыі і рабочае клясы тав. СТАЛІНЫМ, у бязьлітаснай барацьбе з клясавым ворагам, «у барацьбе за няўхільнае і паслядоўнае правядзеньне генэральнай лініі партыі, у барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, у барацьбе з «левацкімі» перагібамі і контр - рэвалюцыйным трацкізмам, шляхам бязьлітаснага разгрому антыпартыйных груповак, шляхам рашучага выкрыцьця клясавага ворага з партбілетам у кішэні з ліку буржуазных перараджэнцаў».

Пленум сумесна з партактывам асоба падкрэсьлівае выключную, сусьветна-гістарычную ролю правадыра партыі і міжнароднага пралетарыяту, найвялікшага з паплечнікаў Леніна—тав. СТАЛІНА, які забясьпечвае сваім кіраўніцтвам згуртаваньне і адзінства ленінскай бальшавіцкай партыі ў непрымірымай барацьбе за рашаючыя перамогі пяцігодкі.

Вялізарнейшай перамогай партыі і рабочае клясы зьяўляецца перааданьне нацыянальных акраін, эканамічна і культурна адсталых, якія зьяўляліся да пралетарскай рэвалюцыі аб'ектам калёніяльнай эксплёатацыі ў эканамічна і культурна перадавыя рэспублікі нашага Саюзу.

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі, тэмпы разьвіцьця народнае гаспадаркі, выпераджаючыя агульнасаюзныя тэмпы, рост рабочае клясы за гады рэвалюцыі з 11 тысяч да 100 тысяч, дасягненьні ў галіне калектывізацыі, пад'ём матар'яльнага і культурнага ўзроўню шырокіх мас працоўных, рост нацыянальных кадраў,—усё гэта на фоне эканамічнага руйнаваньня Заходняй Беларусі, прыгнечаньня польскага фашызму і зьверскай расправы з беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам зьяўляецца яскравым паказальнікам вялізарнейшых посьпехаў ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Вызначаны пленумам ЦК і ЦКК сярэдні гадавы прырост прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы ў 13—14 проц. і народна-гаспадарчы плян на 1933 г. ставяць перад усімі партарганізацыямі, перад кожным бальшавіком, перад усімі рабочымі задачу ўпартай і настойлівай барацьбы за асваеньне новых вытворчасьцяй і дасягненьне праектнай магутнасьці, за падняцьце прадукцыйнасьці працы, за паляпшэньне якасьці прадукцыі і зьнижэньне сабекошту, за поўнае і бязумоўнае выкананьне вытворчай праграмы, за павышэньне рэвалюцыйнай пільнасьці і і ліквідацыю барацьбы з пранікненьнем класава-варожых элементаў у сацыялістычныя прадпрыемствы.

У сьвядомасьць кожнага рабочага і калгасьніка павінна быць укаранена, што... «энтузіязм, пафас новага будаўніцтва... «павінны мы дапоўніць энтузіязмам, пафасам асваеньня новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным падняцьцём прадукцыйнасьці працы, сур'ёзным зьнижэньнем сабекошту.У гэтым зараз галоўнае» (Сталін). Вырашэньне гэтых задач патрабуе новага, магутнага падёму сацпаборніцтва і ўдарніцтва, бязьлітаснай барацьбы з лодырамі, лятунамі, прагульшчыкамі—дэзарганізатарамі вытворчасьці.

Пленум Менгаркому сумесна з партактывам зьвяртае ўвагу ўсёй партарганізацыі і кожнага камуніста на гістарычную прамову тав. СТАЛІНА «Аб працы на вёсцы», як на баявую ленінскую праграму, у барацьбе за далейшую сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі. Высунутыя тав. Сталіным задачы набываюць вялікае значэньне ва ўмовах Беларусі і Менскага раёну, дзе ўрокі сельска-гаспадарчых заготовак цалкам і поўнасьцю пацьвярджаюць ускрытыя ў прамове тав. Сталіна карэньні недахопаў у нашай рабоце на вёсцы, якія выявіліся ў недаацэнцы падвойнасьці прыроды калгаснага гандлю, у спробах падмяніць дакладнае бальшавіцкае кіраўніцтва калгасным рухам дробна-буржуазнай ідэалізацыяй калгасаў, няўменьнем ускрыць новыя манэўры клясавага ворага і дабіцца ачысткі ад кулацкіх і контр-рэвалюцыйных элементаў, якія выявіліся ў гніла-лібэральных адносінах партыйных і савецкіх арганізацый да заготовак.

Вопыт заготовак па БССР наглядна пацьвердзіў усю правату ўказаньняў т. Сталіна аб тым, што «мы стаім на чале ўлады, мы ўладаем сродкамі дзяржавы, мы закліканы кіраваць калгасамі, і мы павінны несьці ўсю паўнату адказнасьці за работу на вёсцы».

Арганізуемыя паліталдзелы пры МТС і саўгасах павінны стаць магутнейшым вагаром у руках партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, па сацыялістычным перавыхаваньні калгасьнікаў і далейшым узмацненьні пазыцый пралетарскай дзяржавы на вёсцы. Пленум даручае бюро ГК КП(б)Б неадкладна прыступіць да падбору 100 праверанных і выпрабаваных на канкрэтнай справе бальшавікоў на работу ў паліт аддзелы і кіруючую работу ў сельсаветы і калгасы.

У цэнтры ўвагі ўсёй партарганізацыі і кожнага камуніста ў паасобку на бліжэйшы час павінна быць пастаўлена ударная падрыхтоўка і правядзеньне весьнавой пасеўнай кампаніі і поўнае забясьпечэньне выкананьня дырэктыў партыі аб рашучым падняцьці ўраджайнасьці. Магутным вагаром у гэтых адносінах, павінен паслужыць новы закон Саўнаркому СССР і ЦК УсеКП(б) «Аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі».

Бліжэйшай задачай усёй КП(б)Б, у першую чаргу Менскай арганізацыі, зьяўляецца завяршэньне ўсіх відаў заготовак, у асаблівасьці ільну і бульбы з тым, каб планы былі выкананы ўсімі раёнамі, сельсаветамі, вёскамі, калгасамі і дварамі.

Далейшае разгортваньне таварапотку паміж горадам і вёскай патрабуе ўзмацненьня барацьбы за выраб тавараў шырокага спажываньня, усяго мернага павялічэньня рыначных фондаў, а таксама ўсямернага паляпшэньня прыгарадных гаспадарак і работы па стварэньні ўласнай харчовай базы на кожным прадпрыемстве. Усё гэта павінна зьявіцца аднэй з важнейшых задач кожнай партарганізацыі, кожнай прафэсыянальнай арганізацыі, кожнага гаспадарніка ў справе далейшага паляпшэньня матар'яльнага дабрабыту і бытавога абслугоўваньня рабочых.

Нашы перамогі выклікаюць шалёнае супраціўленьне разгромленага, але ашчэ канчаткова не дабітага кляса савага ворага, які мяняе мэтады і тактыку сваёй барацьбы. У гэтых умовах «рэвалюцыйная пільнасьць і гатоўнасьць зьнішчыць клясавага ворага павінна зьяўляцца асноўным нжазам камуніста і галоўнай прадпасылкай далейшага прасоўваньня ўперад».

Пленум Менгаркому сумесна з партактывам ухваляе рашэньні ЦК УсеКП(б) аб антыпартыйнай групоўцы Эйсмонта, Талмачова, Сьмірнова і інш. На рубяжы двух пяцігодак, збан крутаваўшая кучка буржуазных перараджэнцаў, двурушнікаў, выконвала сацыяльны заказ рэштак капіталістычных элемэнтаў унутры краіны і міжнароднай контр-рэвалюцыі.

Лічачы папярэджаньне пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) былым лідэрам правай апазыцыі Томскаму, Рыкаву, Шмідту, якія падтрымлівалі сувязь з Сьмірновым і Эйсмонтам і давалі поводы сваімі паводзінамі ўсім антыпартыйным элементам разьлічваць на іх падтрымку апошнім, Пленум сумесна з партактывам патрабуе ад Томскага, Рыкава і Шмідта безагаворачнага выкананьня ўсіх патрабаваньняў, прадыкуленых да іх пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б). Пленум з партактывам лічаць, што малейшае хістаньне ў далейшым кato-небудзь з былых лідэраў права-кулацкай апазыцыі павінна пацягнуць неадкладнае прыняцьцё самых суровых мер партыйнага спагнаньня.

Пленум падкрэсьлівае, што выкананьне пістарычных задач, пастаўленых студзеньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) перад партыяй і рабочай клясай, калгасным сялянствам, патрабуюць ад кожнай ячэйкі, ад кожнага камуніста ў паасобку ўзмацненьня адказнасьці за даручаную работу, ня лізарнага ўзмацненьня жалезнай партыйнай дысцыпліны, вялізарнай рэвалюцыйнай пільнасьці, бязьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам і бальшавіцкай непрымірымасьці ў барацьбе з яго агентурай—апартунізмам усіх адценьняў, буржуазна-нацыяналістычнымі элемэнтамі, рэшткамі нацдэмаўшчыны, якія заўсёды прыкрываюць сваю антысавецкую работу фальшыва-нацыянальным сьцягам.

Пленум вітае рашэньне ЦК і ЦКК УсеКП(б) «арганізаваць справу чысткі такім чынам, каб забясьпечыць у партыі жалезную пралетарскую дысцыпліну і ачышчэньне партыйных радоў ад усіх ненадзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элемэнтаў.

Пленум рашуча абавязвае ўсю парт арганізацыю шляхам неаслабнага разгортваньня самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, весьці далейшую, настойлівую, сапраўды бальшавіцкую работу па выяўленьні, выкрыцьці і ачышчэньні партыі ад ненадзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элемэнтаў, наносячы разам з тым руйнуючыя ўдары малейшым праяўленьням сямейсьці, групоўчыны, кругавой парукі, спробам захаваць, замазаць злоўживаньні, прарывы і недахопы ў працы; малейшым спробам зашіску бандзішчыцкай самакрытыкі. Асаблівы ўплывінен быць зроблен на барацьбу з славесной дэкларацыйнасьцю ў самакрытыцы, на барацьбу супроць прарэнцтва і гніла-лібэральных адносін да канкрэтных носьбітаў злоўжываньняў, прарываў, недахопаў і памылак, на неабходнасьць падмацаваньня самакрытыкі канкрэтнай справай выкрыцьця і ачысткі нашых радоў ад апортуністаў, перараджэнцаў, алілуйшчыкаў, гнільля, жулікаў і гультаёў.

«Галоўнейшай задачай партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый кожнага камуніста, рабочага і калгасьніка зьяўляецца рашучая барацьба за раскрадваньнем грамадзкай маемасьці, далейшае ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, павышэньне рэвалюцыйнай клясавай пільнасьці». «Моцная магутная дыктатура пралетарыяту—вось што нам патрэбна цяпер для того, каб расьсеяць ашчэнт апошнім шткі паміраючых клясаў і разьбіць злодзейскія махінацыі» (Сталін).

Аб'яднаны пленум ГК і ГарКК менска з актывам са здавальненьнем адзначае, што пачатая перабудова арганізацыі партыйных і савецкіх арганізацый на аснове рашэньня ЦК УсеКП(б) і ЦКК УсеКП(б) дзе сельска-гаспадарчых заготовак забясьпечыла ў асноўным ліквідацыю прарыву па заготоўках і бальшавіцкае выкананьне ва ўстаноўленым тэрміны.

Пад апэрацыйным і канкрэтным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з ГІКАЛО, забясьпечыўшым бальшавіцкае правядзеньне заготовак, калектыя Беларусі змагла на аснове маганьня гніла-лібэральных адносін да заготовак нанесьці руйнуючы удар па кулаку, пачаць ачыстку сваіх радоў ад перараджэнцкіх элемэнтаў і вышэй узьняць аўтарытэт партыі сярод чох шырокіх мас працоўных.

Пленум Менгаркому асабліва падкрэсьлівае необходнасьць замацаваньня і далейшага паглыбленьня перабудовы партыйнай і савецкай работы, забясьпячэньня падрыхтоўкі і правядзеньня весьнавой сяўбы.

Асаблівая ўвага павінна быць зроблена на перабудову работы саветаў і гаспадарчых арганізацый, перш за ўсё тых, куды, як паказалі спраўы Белдзяржснабу, Дзяржземтрэсту і іншых, пралезьлі клясава-варожыя элементы, рэшткі нацдэмаўшчыны, школьнікі, дзе таксама моцны элемэнты разбанасьці, безадказнасьці і т. д.

Пленум сумесна з партактывам пэўнівае ЦК УсеКП(б) і ЦКК КП(б)Б, што, узброеная бальшавіцкімі рашэньнямі пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) Менская партарганізацыя, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, будзе ў найвых радох ленінскай партыі ў барацьбе за ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых пленумам, за выкананьне і другой пяцігодкі.

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б)!
Няхай жыве правадыр нашай партыі і сусьветнага пралетарыяту СТАЛІН!

Аб вывазцы мінэральнага ўгнаеньня, вапны, торфу, збору і хаваньні попелу

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 25 студзеня 1933 г.

1. ЦК лічыць абсалютна недапушчальным і злачынным, што да гэтага часу мінэральнае ўгнаеньне з чыгуначных станцый не вывезена, ня гледзячы на прамую і катэгарычную дырэктыву з боку ЦК.

ЦК прапануе Трактарацэнтрам, пад пэрсанальную адказнасьць т. т. Качука, Грабенчыка, Дубоўскага, дырэктароў МТС і саўгасаў у 5-ці дзённы тэрмін забясьпечыць вывазку з чыгуначных станцый усяго маючагася. як завезенага раней, так і завазімага за раз мінэральнага ўгнаеньня і не пазьней 1-га лютага спэцыяльна далажыць ЦК аб выкананьні.

2. Абавязаць дырэктароў МТС і саўгасаў завезенае да вясеньняй с-гасп. кампаніі мінэральнае ўгнаеньне вывазіць з чыгуначных станцый не пазьней 3-х дзённага тэрміну пасьля яго прыбыцьця.

Абавязаць упаўнаважанага НКШЗ т. Эгле пад асабістую адказнасьць спыніць практыку выгрузкі мінэральнага ўгнаеньня пад адкос, пры наяўнасьці складачных памяшканьняў на станцыях, вядучы рашучую барацьбу з фармальна-бюракратычнымі адносінамі з боку асобных начальнікаў станцый сьвячасова аказваючаць спажыўцоў мінэральнага ўгнаеньня аб яго прыбыцьці.

3. Для выкананьня плянаў вапнаваньня глебы ў 10 тыс. га да вясеньняй пасеўнай кампаніі, абавязаць дырэктароў МТС, саўгасаў і праўленьні калгасаў неадкладна прыступіць да вывазкі вапны з вапняных млынаў з тым, каб да 1-га сакавіка вывезьці ня менш 15 тыс. тон і да 15-га красавіка 10 тыс. тон.

Наркамзему, пад адказнасьць т. Рачыцкага і Упаўнаркамсаўгасаў, пад адказнасьць т. Сьмірнова ў 5-ці дзённы тэрмін давесьці плян вывазкі вапны да раёнаў, МТС, саўгасаў. Райкомам і РВК давесьці плян вапнаваньня да калгасаў і сельсаветаў.

4. Абавязаць Райкомы і РВК неадкладна арганізаваць зімовую вывазку гною на палі з такім разьлікам, каб ня менш 60 проц. усяго гною было вывезена ў палі ў зімовы час для вясеньняй с-г. кампаніі, устанавіўшы па дэкадны плян вывазкі.

Лічыць необходным ня менш 50 проц. гною ад жывёлы, знаходзячай ся ў аднаасобным карыстаньні калгасьнікаў скарыстаць для калгасных палёў, за што калгасы аказваюць дапамогу калгасьнікам падсцілкай і цягавай сілай для вывазкі гною на іх агароды.

Даручыць Гаркомам і Гарсаветам, прадпрыемствам і Жактам неадкладна арганізаваць сыстэматычны збор драўнае і своечасовую вывазку на палі.

Вылучыць спэцыяльных членаў Прэзыдыуму Гарсавету, Упаўнаважаных Жактаў і домакіраўніцтваў, на якіх усклясьці пэрсанальную адказнасьць па збору, правільнаму хаваньню і своечасовай вывазцы попелу і гною.

Для больш поўнага і рацыянальнага скарыстаньня ўсіх гарадзкіх адкідаў, адходаў ад прамысловасьці,—Гарсаветам арганізаваць спэцыяльныя свалачныя пункты, на якіх устанавіць кампасьціраваньне і інш. пераапрацоўку адкідаў і адходаў, забараніўшы скарыстаньне без належнай пераапрацоўкі і кампасьціраваньня гарадзкіх адкідаў і адходаў прамысловасьці і гною, забранага з базараў (якія значна заражаюць сарнякамі палі прыгарадных гаспадарак).

6. Абавязаць Гарсаветы і РВК у дэкадны тэрмін правесьці прымацаваньне прыгарадных саўгасаў і калгасаў па зборы і вывазцы ўгнаеньняў да жактаў, прадпрыемстваў, школ, больніц і інш.

Ускласьці пэрсанальную адказнасьць на дырэктароў саўгасаў і праўленьні калгасаў, за своечасовы збор попелу з гэтых прадпрыемстваў праз кожныя 10 дзён.

7. Абавязаць камандваньне вайсковых частак, кіраўнікоў дзяржаўных і гаспадарчых арганізацый, якія маюць гной, пасьля здавальненьня патрэб сваіх гаспадарак, перадаваць увесь гной прыгарадным саўгасам і калгасам.

Устанавіць, што ўсе дзяржаўныя і гаспадарчыя арганізацыі, вайсковыя часткі вывозяць на сваім транспарце ўсе запасы маючагася ў іх гною.

Гарсаветам неадкладна ўстанавіць нагрузку на грузавую машыну і конны транспарт з тым, каб вывезьці ня менш 15 тон на адну машыну і 3 тоны на аднаго каня. Вывазку скончыць не пазьней 1-га красавіка.

8. Пэрсанальную адказнасьць за своечасовую вывазку, хаваньне і правільнае скарыстаньне гною, мінэральнага ўгнаеньня, вапны, попелу і торфу, ня суць па Наркамзему—т. Еўдакімаў, Упаўнаркамсаўгасаў—т. Аўчыньнікаў, у раёнах—загадчыкі Райза.

Даручыць ЦК ЛКСМБ у 3-х дзённы тэрмін распрацаваць спэцыяльны плян канкрэтных мерапрыемстваў аб удзеле камсамольскіх арганізацый у ажыцьцяўленьні гэтай пастановы.

9. За абсалютную бязьдзейнасьць, праступнае ігнараваньне прамых дырэктыў ЦК і СНК аб своечасовай вывазцы і скарыстаньні мінугнаеньняў у колькасьці 450 тон—дырэктару Дамашавіцкай МТС—т. Крычаўцаву абвясьціць вымову і папярэдзіць, што ў выпадку невыкананьня гэтага заданьня да 1-II 33 г.—ён будзе выключаны з партыі і адданы пад суд.

Падцьвердзіць пастанову НКЗем, зьняцьці з працы з аддачай пад суд дырэктара Целушынскай МТС—тара, не вывезшага 12 вагонаў мінэральных угнаеньняў.

Дырэктару саўгасу «Мсьціслаў» Шафрану, не вывезшаму 2 вагоны угнаеньняў—абвясьціць вымову з папярэджаньнем, што ў выпадку невыкананьня заданьня па вывазцы мінугнаеньняў да 1-II 33 г.—ён будзе выключаны з партыі і адданы пад суд.

Дырэктарам саўгасу «Харомаў» тав. Лубсякову, не вывезшаму мінугнаеньняў і дырэктару саўгасу «Ударнік» т. Азарэнчу—абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем.

За нерашучае рэарганізацыю ў справе вывазкі і хаваньня мінугнаеньняў былому кіраўніку А-О Мінугнаеньня тав. Гнеўка—абвясьціць вымову.

Абавязаць Сельгасснаб тав. Ліпіла прыняць канкрэтныя апэратыўныя меры, забясьпечваючыя своечасовы вывоз і рэалізацыю залежалых мінугнаеньняў.

Папярэдзіць усіх дырэктароў саўгасаў, сакратароў Райкомаў і старшынь РВК, што ў выпадку невыкананьня мінугнаеньняў у 5-ці дзённы тэрмін—яны будуць прыцягнуты да партыйнай і судовай адказнасьці.

3-я сэсія ЦВК СССР

Раніцою 27 студзеня ў Саюзным савеце Савеце нацыянальнасьцяй адкрыліся спрэчкі па дакладах т. т. Грынько і Чуцкаева аб адзіным дзяржбюджэце на 1933 год.

У спрэчках падкрэсьлівалася, што посьпехі фінансавай работы аллюстроўваюць вялізарныя дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва. Грунтуючыся на вопыце, члены ЦВК вылілі слабыя месцы ў фінансавай гаспадарцы і ўказвалі шляхі далейшага яе ўмацаваньня. Упор у спрэчках быў накіраваны на неабходнасьць рашучай барацьбы за цьвёрды рэжым эканоміі, за найбольш матэгодная выдаткаваньне дзяржаўных сродкаў.

Член калегіі Наркамфіну СССР тав. Маймін, падаўшы даныя аб выкананьні народнай гаспадарчага плану за першыя 20 дзён студзеня, зазначае, на ж неадвальняючасьць. Трэба ўзяць бальшавіцкія тэмпы ў справе выкананьня фінпляну з першых-жа дзён новага гаспадарчага году,—таварыш тав. Маймін,—лічыць у далейшым нагнаць патрачаны час будзе цяжка. Што-ж датычыць фінапарату, дык перад намі стаіць сур'ёзная задача—ачысьціць яго ад клясава-варожых элемэнтаў, асабліва гэта датычыць фінапаратаў калгасаў, куды часта пралазіць кулачо ў якасьці бухгальтароў, рахункаводаў, кладаўшчыкоў і г. д., імкнучыся захапіць у свае рукі фінансавыя справы калгасаў.

Тав. Лебедзь (РСФСР) завастрыў увагу сэсіі на пытаньнях фінансаваньня рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці. Фінплян 1932 году выконваецца [illegible]

наглядалася дэфіцытнасьць [illegible] цовых і рэспубліканскіх вы[illegible] ным вядзеньнем справы, неўважлівасьцю, расхлябанасьцю, няўменьнем [illegible] ваць, адсутнасьцю мабілізацыі [illegible]

За ГРАНІЦАЙ

Бої ў Паўночным Кітаі

ТОКІЁ. Агенцтва «Сімбун Рэнго» паведамляе з Шанхайгуаню аб аднаўленьні ваенных дзеяньняў у Паўночным Кітаі паміж японскім і кітайскім войскам. Паводле слоў агенцтва, «галоўныя сілы Хо-Чжоу-Го напалі на японскае войска ў Цзюменькоу (на поўнач ад Шанхайгуаня) і пасьля 3-гадзіннага бою быў адбіты».

Японскія ваенныя ўлады накіравалі папаўненьні ў Цзюменькоу з Суйчжуну, але апошнія прыбылі пасьля бою.

Паветраная бамбардыроўка кітайскага войска

ТОКІЁ. 27-I. Паводле паведамленьняў агенцтва «Сімбун Рэнго» з Тунляо, апэрацыі японская паветранага флёту ў раёне Кайлу (правінцыя Жэхэ) працягваюцца, прычым флёт пашырае зону дзеяньняў у заходнім кірунку. 26 чысла японскія паветраныя сілы бамбардыравалі разьмяшчэньне кітайскага войска на паўднёвы захад ад Цяньпаню (Цяньшань у 75 кілёмэтрах на паўночны захад ад Кайлу).

Інструкцыя Нанкіна кітайскім дыплёматам

ШАНХАЙ. 27-I. Згодна паведамленьняў афіцыйнага агенцтва нанкінскага ўраду «Сэнтраль ньюс Аджэнсі», міністэрства замежных спраў нанкінскага ўраду праінструктавала кітайскіх дыплёматаў заграніцай паведаміць урадам пры якіх яны акрэдытаваны, што Кітай адхіліць любую частку дакладу, які падрыхтоўваецца падкамісіяй у Жэневе, калі апошняя, па думцы кітайскага ўраду, ня будзе адпавядаць кітайскім інтарэсам.

Забарона пасеву гаоляну ў Манчжурыі

ШАНХАЙ. 27-I. З Манчжуры паведамляюць, што японскія ўлады забаранілі разьвядзеньне гаоляну на адлегласьці тысячы мэтраў па абодных баках Паўднёва-Манчжурскай чыгункі, з тае прычыны, што гаолян дае добрае прыкрыцьцё. У мінулым годзе было забаронена сеяць гаолян на адлегласьці 500 мэтраў, але гэтая мера, відавочна не дала станоўчых рэзультатаў. Забаронена таксама культываваць гаолян на адлегласьці 2.000 мэтраў ад любой чыгуначнай станцыі.

Японская ваеншчына за выхад з Лігі нацый

ТОКІЁ. 27-I. Агенцтва «Сімбун Рэнго» зазначае, што ў ваенных колах усё больш схіляюцца да думкі аб неабходнасьці выхаду Японіі з Лігі нацый у сувязі з прыстасаваньнем параграфу 4-га, артыкулу 15 статуту Лігі нацый. Паводле слоў агенцтва, на ваенныя колы вялікі ўплыў зрабіла паведамленьне галавы ваеннай дэлегацыі на канфэрэнцыі па раззбраеньні, які зазначыў, што «рэкамэндацыі, якія распрацоўваюцца Лігай нацый, ня прыймальны для Японіі».

У сувязі са створанай у Жэневе абстаноўкай, зазначае далей агенцтва, ваенныя лідэры і міністэрства замежных спраў, якія да гэтага часу супярэчылі супроць выхаду Японіі з Лігі нацый, зараз прыступілі да выпрацоўкі «канчатковага рашэньня». У міністэрстве замежных спраў зазначаюць, што апошняе не разглядала пытаньня аб выхадзе Японіі з Лігі нацый, а таксама не пасылала ніякіх новых інструкцый японскай дэлегацыі.

Забастоўка ў Дэтройце

НЬЮ-ЁРК. 26-I. Паводле паведамленьняў «Асошыэйтэд Прэс» з Дэтройту, забастоўкі на прадпрыемствах «Брыгс Бодзі кампані» прывялі да закрыцьця аўтамабільных заводаў Форда. Кампанія «Брыгс Бодзі кампані» забясьпечвала фордаўскія заводы аўтамабільнымі кузавамі.

Прадстаўнікі адміністрацыі фордаўскіх заводаў пагражаюць спыненьнем дзейнасьці сваіх заводаў і звальненьнем 40.000 дэтройцкіх рабочых, а таксама звальненьнем 60.000 рабочых на другіх прадпрыемствах Форда.

Паводле даных органу кампартыі «Дэйлі Уркер», звыш 10.000 рабочых бастуюць у сучасны момант у Дэтройце. Усімі забастоўкамі кіруе «Саюз аўтамабільных рабочых», які далучаецца да рэзалюцый Лігі прафсаюзнага адзінства.

Сутычкі беспрацоўных з паліцыяй у ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК. 26-I. Паводле паведамленьняў агенцтва «Асошыэйтэд прэс» з Спрынгфільда (штат Ілінойс), прыбыўшыя з розных пунктаў штату 300 дэлегатаў—членаў саветаў беспрацоўных—наладзілі бурную дэманстрацыю перад домам губарнатара штату Ілінойс, патрабуючы дапамогі галадаючым сем'ям беспрацоўных.

Паміж дэлегатамі і паліцыяй адбылася сур'ёзная сутычка. Дэлегаты выламалі дзьверы губарнатарскай канцылярыі і ўварваліся таксама на паседжаньне заканадаўчага савету. Шматлікіх дэлегатаў зьбіваюцца галадаючымі арнякамі; іншыя—беспрацоўныя, пры быўшыя з Чыкага, дзе палова працоўнага насельніцтва пазбаўлена работы. У Спрынгфільдзе мабілізавана войска для папярэджаньня звароту дэлегатаў, высланых за межы штату.

Паведамляюць аб шматлікіх выпадках сутычак паміж паліцыяй і беспрацоўнымі і ў другіх гарадох ПАЗШ.

ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАНЬНЕ ЛЁНАЗАГАТОВАК

баявая задача партарганізацый і саветаў Сіроцінскага, Мсьціслаўскага, Лепельскага, Асьвейскага, Бешанковіцкага раёнаў

ЧОРНАЯ ДОШКА

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК БУЛЬБЫ І ІЛЬНУ:

ТАЛАЧЫНСКІ

(сакратар РК т. Славін, старшыня РВК т. Лагераў, упаўнаважаны ЦК т. Тамашэўскі)

ДУБРОВЕНСКІ

(сакратар РК т. Кацман, старшыня РВК тав. Семашко, упаўнаважаны ЦК т. Шаліма)

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ:

СЕНЬНЕНСКІ

(сакратар РК т. Дашукевіч, старшыня РВК т. Себесевіч, упаўнаважаны ЦК т. Бэрзін)

СІРОЦІНСКІ

(сакратар РК т. Усенка, старшыня РВК т. Ражноўскі, упаўнаважаны ЦК т. Вільчак)

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ЗАНЕСЕНЫ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ НАСТУПНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ:

па Дзяржынскім: вёска Шатанаўшчына, Пятрыкоўскім раёне: Піцкі,
Клімавіцкім раёне: Красавіцкі сельсавет,
Бягомльскім раёне: Дамражыцкі с-с,
Лагойскім раёне: Гайнінскі,
Чашніцкім р-не: Стражавіцкі,
Клічаўскім Віркаўскі, Грыбавецкі, Дубеньскі

па Сураскім: Камароўскі,
Аршанскім: Буеўскі,
Пухавіцкім: Гарэліцкі, Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі,
Вушацкім раёне: Усайскі сельсавет,
Рэчыцкім раёне: Караваіцкі сельсавет,
Мсьціслаўскім раёне: Татаршчанскі і Даўгавіцкі сельсаветы.

Аб зьняцьці з чорнай дошкі сельсаветаў. Пастанова ЦК КП(б)Б ад 25 студзеня 1933 г.

Зьняць з чорнай дошкі Артукаўскі і Холміцкі сельсаветы Рэчыцкага раёну, як выканаўшыя загатоўкі

Там, дзе беспакарана арудуе клясавы вораг

(Ад нашага спэцкора)

ГАРАДОК. ХВАШНЯНСКІ сельсавет занесены на чорную дошку. Ён самы адсталы па ўсіх відах загатовак. Плян лёназагатовак па сельсавеце выкананы толькі на 70 проц. Кулацкі сабатаж загатовак ня зломлены. З 34 кулацка-заможных гаспадарак сельсавету ніводная ня выканала пляну па цьвёрдых заданьнях.

Зрываюцца загатоўкі і па калгасах. Калгас «Чырвоная зьмена» ня здаў (прадаў) ніводнага клгр. лёнавалакна (паводле пляну—145 цэнт); замест 72 тон трасты калгасам здана толькі 22 тоны. Пераважную большасьць лёну ў калгасе пагнаілі. Гэта зроблена невыпадкова. Старшыня калгасу Купрыянаў і брыгадзір Цымкін—былыя кулакі. Гэта кулацкая зграя пралезла ў калгас, каб шкодзіць, каб разбурыць калгасную вытворчасьць.

Ня лепш справа з лёназагатоўкамі і ў калгасе імя СТАЛІНА. Калгас меў 5 га лёну але ня здаў ніводнага кілёграму лёнавалакна. Лён быў разасланы неабмалочаным. Траста пагніла на сьцелішчы. Але старшыня калгасу ШЫЎКО, гэты кулацкі агент, чамусьці застаўся непакараным.

Дзе-ж прычыны такога ганебнага прарыву, які стварыўся ў сельсавеце? Асноўная прычына крыецца ў засьмечанасьці кіраўніцтва сельсавету чужымі варожым элемэнтамі. Сакратар партячэйкі КАЖАМЯКА, старшыня сельсавету САВАСЬЦЯНАЎ, сакратар ХАРКОЎ упаўнаважаны ЦК МАКОЎСКІ і ўпаўнаважаны РВК МЕДАНІК увесь час сядзяць у сельсавеце. Масавая работа падменена голым адміністраваньнем. За ўвесь час лёназагатовак па сельсавеце не праведзены ніводны сход беднаты. Ня выходзячы з памяшканьня сельсавету яны давалі загады арыштоўваць няздатчыкаў лёну, ня маючы на тое распараджэньня і дазволу раённых арганізацый. Былі незаконна арыштаваны серадняк Міхайлаў, Конан, Арлоў, Андрэенка і інш.

На апошнім пленуме сельсавету Кажамяка і Харкоў імкнуліся давесьці, што нявыкананьне пляну лёназагатовак ёсьць вынік «недасеву», «недароду», што «лёну ў сельсавеце няма». Гэтую апартуністычную вылазку агентаў клясавага ворага ўшчэнт разьбіваюць перадавыя калгасы сельсавету —калгас імя ВАРАШЫЛАВА і «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», якія выканалі плян лёназагатовак на 100 проц. У чым-жа «сакрэт» перамог гэтых калгасаў? У тым, што на чале іх стаяць сапраўдныя бальшавікі, што яны далі рашучы адпор усякім разважаньням аб тым, што «няма лёну».

Паданыя вышэй факты сыгналізуюць аб тым, што вакол загатовак па Хвашнянскім сельсавеце не разгорнута бальшавіцкая работа, кулацкі сабатаж ня зломлены. Гэта павінна ўлічыць Гарадоцкая партарганізацыя і яе кіраўніцтва.

ХМЕЛЬ.

Ход лёназагатовак па лёнаводных раёнах БССР

(у проц. на 27 студзеня)

Бальшэйкі	96,5	Сенненскі	69,6
Лёзьненскі	95,9	Полацкі	69,1
Чавускі	95,4	Лепельскі	68,9
Чашніцкі	89,7	Асьвейскі	68,5
Сураскі	88,5	Мсьціслаўскі	63,9
Крупскі	86,2	Сіроцінскі	57,9
Дубровенскі	85		
Шклоўскі	81,4		
Горацкі	81,7	Разам па зоне 78,8	
Расонскі	78,4		
Талачынскі	76,7		
Дрысенскі	76,4	Усяго па БССР 79,6	
Вушацкі	74,5		
Гарадоцкі	73,3		
Бешанковіцкі	69,8		

Зводна вывазкі торфу па БССР за пяцідзённку ад 20 па 24 і за дзень 26 студзеня 1933 г.

Па сямі раёнах агульнае заданьне за пяцідзённку складала 16070 тон, вывезена толькі 3421 тоны, або 21,3 проц.

Па паасобных раёнах плян вывазкі выкананы наступным чынам: Заслаўскі раён пры заданьні ў 365 тон, вывез 423 тоны, або 115,0 проц. заданьня, Ас'павіцкі з 1970 тон вывез 677 тон або 34,2 проц., Горацкі пры заданьні ў 460 тон вывез 175 або 38,0 проц. заданьня, Смалявіцкі з 5570 тон вывез 1412 тон або 25,3 проц., Талачынскі з 635 тон вывез 88 тон або 5,9 проц., Барысаўскі з 3090 вывез 558 тон або 18,0 проц. і Чашніцкі пры заданьні ў 3980 тон вывез 141 або 3,5 проц. заданьня.

Дзённае заданьне за 26 студзеня выканана асобнымі раёнамі наступным чынам: Горацкі на—146,7 проц., Смалявіцкі—на 64,0 проц., Заслаўскі—54,7 проц., Гомельскі—на 105,0 проц., Ас'павіцкі—21,4 проц., Чашніцкі—10,4 проц. і Барысаўскі—44,6 проц.

Першым: ў выкананьні пляну торфазывазкі ідуць Заслаўскі, Горацкі, Смалявіцкі, Гомельскі і Ас'павіцкі раёны.

Як бачна, большасьць раёнаў на сёнешні дзень ігнаруюць торфавывазку, недаацэньваюць рашэньняў партыі і ўраду па гэтым пытаньні. Напамінкі і ўраду па гэтым пытаньні. Напамінкі ў нашай газэце былі імі не пачуты. І на сёнешні дзень няма ніякіх эрухаў, нават няма зводак аб рабоце па вывазцы торфу.

Да раёнаў, якія ігнаруюць і недаацэньваюць пастановы партыі і ўраду, па пытаньнях вывазкі торфу, патрэб на ўжыць жорсткія меры.

С.

Хроніка

▲ Для ўстанаўленьня кантыгентаў і сыстэматычнай праверкі іх, арганізацыі выдачы наборных дакумантаў, іх уліку і хаваньня, пры Наркамснабе БССР арганізавана кіраўніцтва па выдачы наборных дакумантаў. Аналёгічныя бюро наборных дакумантаў арганізуюцца па гарадох БССР пры горснабах.

▲ ДЭКАДНІК АЧЫСТКІ ДАМОЎЛАДАНЬНЯЎ па гор. Менску абвешчан з 25 студзеня. Для правядзеньня дэкадніка пры гарсавеце створан штаб. У правядзеньня дэкадніка пры маюць удзел наступныя сэкцыі гарсавету: аховы здароў'я, камунальная, жыльлёвая, адміністрацыйна-прававая, чырвоны крыж; саюзы: Мэдсанпрацы, РКХ і гарадзкіх прадпрыемстваў. Дом санасьветы разгортвае шырокую санасьветную работу сярод працоўнага насельніцтва. Шырокі ўдзел у правядзеньні дэкадніка прымуць санкамісіі жактаў.

▲ НОВАЯ АМБУЛЯТОРЫЯ І БАЛЬНІЦА будуць пабудаваны ў 1933 г. у саўгасе «Вішнёўка».

▲ 27 ТОН УТЫЛЮ САБРАНА ПА Віцебску за час правядзеньня камсамольска-фізкультурнай эстафэты «За шырспажыў і збор утылю». У перадзе ідуць фізкультурнікі скуранога заводу імя Лекерта і акулярнай фабрыкі.

▲ 130 ЛІХТАРОЎ УСТАНОЎЛЕНА па вуліцах Менску ў 1932 г.

▲ ДЛЯ ДАПАМОГІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ў падшэфны калгас выяжджае брыгада акторaў Яўрэйскага Дзяржаўнага тэатру. У склад гэтай брыгады яўсэкцыя ССП БССР вылучыла трох пісьменьнікаў.

▲ У РЭАЛІЗАЦЫЮ ЗАКЛЮЧАНАГА САЦДАГАВОРУ з фізкультурнікамі Харкаву сэкцыя барацьбы пры МГСФК выяжджае ў адзін з раёнаў БССР з мэтай перанясеньня вопыту работы на пэрыфэрыю.

▲ 3-Х МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ па пад рыхтоўцы работнікаў дашкольных устаноў (дзіцячыя пляцоўкі і ясьлі) на час падрыхтоўкі да веснавой сяўбы арганізуе НКА БССР. Таварыства «Прыхільнік Дзяцей» вылучае на гэтыя курсы 178 чал.

▲ З прычыны рамонту спыніліся з няткі ў 11-й школе. Вучні будуць разьмеркаваны па іншых школах.

▲ СТВОРАН САЮЗ САВЕЦКІХ МАСТАКОЎ БССР. У Оргбюро уваходзяць т.т. Усс, Грубэ, Гаўрыленка, Воўкаў і Керзін. Кандыдатамі Кастэлянскі і Бэмбель.

▲ ПАСТАНАВІЛІ ЗДАЦЬ (ПРАДАЦЬ) ДЗЯРЖАВЕ ўвесь ўраджай лёну калгасьнікі калгасу «РУХАВІК РЭВАЛЮЦЫІ» Рэчыцкага раёну. Вывачаны плян у 23 тоны выканан, акрамя таго ўжо здана (прадана) звыш пляну 5 цнт лёну. Закончваецца апрацоўка і здача (продаж) дзяржаве астатніх 7 цнт.

▲ БУКСІРНУЮ БРЫГАДУ накіроўвае Бабруйскі райком КП(б)Б у Жлобінскі раён для дапамогі ў выкананьні пляну загатовак.

▲ У мэтах асваеньня новых трыкатажных машын Віцебскай панчошнай фабрыкі выяжджала спэцыяльная брыгада работніц і мэханікаў. Зараз брыгада ўжо прыступіла да ўстаноўкі і падрыхтоўкі да пуску першых трыкатажных машын «Томпкінс». Брыгадай ўжо запраўлен адзін стол і 2 цыліндры.

У І першым квартале 1933 г. фабрыка атрымае і павінна асвоіць 20 цыліндраў, якія ў II-м квартале дадуць 5,7 тоны трыкатажу. На працягу 1933 г. 260 такіх цыліндраў дадуць 71,6 тоны трыкатажу. Далейшая апрацоўка трыкатажу будзе ўтварацца на фабрыцы імя КІМ.

Новае абсталяваньне для фабрыкі загатоўляе завод «Мэталь» у Палтаве.

У сувязі з гэтым ФЗВ у 1933 г. будзе рыхтаваць 680 вучняў кваліфікаваных спэцыялістаў па вырабе трыкатажнай прадукцыі.

▲ 90.000 КВАДРАТНЫХ МЭТРАЎ вуліц забрукавана ў 1932 г. ў Менску. З іх каменем 73.000 кв. м., клінкерам 12.000 кв. м. і брушчаткай 5.000 кв. м. Акрамя гэтага перабрукавана 98.000 кв. м. Першыя вопыты брукаваньня брусчаткай і клінкерам у Менску праведзены толькі ў 1931 г.

▲ ПРЭЗЫДЫУМ МЕНГАРСАВЕТУ прапанаваў гартопу водпуск дроў для школ і для дашкольных устаноў па гадавой норме закончыць да 1-га лютага г. г.

▲ ЗДРАЎПУНКТЫ БУДУЦЬ арганізаваны на ўсіх прадпрыемствах, якія налічваюць больш 100 рабочых.

Пастанова ЦКК КП(б)Б-НК-РСІ БССР

Адзначыць, што рашаючае значэньне злучной кампаніі IV кварталу ў мясавытворчасьці ў 1933 годзе шмат якімі саўгасамі і цэнтральнымі раёнамі па СТКФ ня ўлічана. Злучная кампанія злосна сарвана па СТКФ у раёнах: Шклоўскім — 13 проц., Кодыльскім — 9 проц., Петрыкаўскім—4 проц., Бярэзінскім — 14 проц. і па трэстах ідзе яўна нездавальняюча (па становішчы на 20 сьнежня па Менскім—68 проц., Магілёўскім—66% Аршанскім — 43 проц.). Паасобныя саўгасы (Славянка — Быхаўскага раёну, «Чырвоны кастрычнік» — Чэрыкаўскага раёну, Зарэчча — Смалявіцкага раёну і інш.) яўна праваліли пляны злучкі ў IV квартале, што зрывае плян здачы таварнай прадукцыі і фармаваньня стада ў 1933 г. Такое становішча зьяўляецца вынікам злачынных адносін, бязьдзейнасьці дырэктароў і зоатэхнікаў саўгасу, старшынь і зоатэхнікаў раённых жывёлаводаб'яднаньняў і загадчыкаў фэрм, — ЦКК-РСІ расцэньвае, як наяўнасьць элемэнтаў вядомага зрыву мясавытворчасьці.

Выходзячы з вышэйпаказанага ЦКК НК-РСІ Бел. пастанаўляе:

1. Пад пэрсанальную адказнасьць дырэктароў саўгасаў, загадчыкаў фэрм і пад непасрэдным кантролем і апэрацыйным кіраўніцтвам дырэктароў трэстаў і старшынь раённых жывёлаводаб'яднаньняў забясьпечыць па саўгасах да 15-I і па СТКФ да 1-II выкананьне пляну злучак за IV квартал з тым, каб да 15-II і па гэтых прарыўных раёнах і саўгасах было забясьпечана поўнае выкананьне і студзеньскага пляну. Зьвярнуць выключную ўвагу на якасьць злучкі.

2. Пад пэрсанальную адказнасьць дырэктароў трэстаў і намесьніка старшыні Жывёлаводаб'яднаньня БССР т. Красоўскага ў трохдзённы тэрмін накіраваць у найбольш прарыўныя раёны і саўгасы сваіх адказных асоб для арганізацыі выкананьня злучных работ ва ўстаноўлены тэрмін, прычым ЦКК НК-РСІ БССР патрабуе ад іх і райКК-РСІ прыцягваць вінаватых у зрыве злучнай кампаніі, нават пры выяўленьні меншай нядбайнасьці, да суровай партыйнай адміністрацыйнай судовай адказнасьці, як за сьвядомы зрыў мясавытворчасьці і адставаньня пагалоўя.

3. Пад пэрсанальную адказнасьць старшынь райКК-РСІ на працягу 5-дзённага тэрміну правесьці праверку і ўстанавіць канкрэтных вінаватых у зрыве злучной кампаніі па саўгасах і СТКФ, як паказаных у данай пастанове, так ва ўсіх астатніх раёнах і саўгасах, прыцягнуўшы іх да жорсткай партыйнай і судовай адказнасьці, забясьпечыўшы ў далейшым непаслабны кантроль за добраякасным выкананьнем пляну злучкі кампаніі, наладзіўшы дасканалы апэрацыйны вучот па гэтай рабоце.

Аб прынятых мерах інфармаваць ЦКК-РСІ Бел. не пазьней 15-I.

4. Пастанову апублікаваць у друку.

ЗА СТАРШЫНЮ ЦКК КП(б)Б
НАМ. НАРКОМА РСІ БССР
ГУРЭВІЧ.

Пастанова ЦКК КП(б)Б-НК РСІ БССР ад 23 студзеня 1933 г.

пра зацверджаньне фін новых каштарысаў на адміністрацыйна-гаспадарчыя патрэбы трэстаў, аб'яднаньняў і пэн р льных гаспадарча-каапэрацыйных і ган лёвых устаноў і арганізацый

1. Абавязаць усе трэсты, аб'яднаньні, цэнтральныя гаспадарча-каапэрацыйныя і гандлёвыя ўстановы і арганізацыі, якія падвергнуты скарачэньню штатаў—да 29 студзеня 1933 г. прадставіць у ЦКК-НК РСІ Бел. (Фін групе) каштарысы на адм.-гас. выдаткі 1933 г.

Устанавіць, што за сваячасовае прадстаўленьне каштарысу ў НК РСІ пэрсанальную адказнасьць нясуць кіраўнікі ўстаноў і галоўныя ці старшыя бухгальтары.

Увага: Каштарысы не павінны прадстаўляць установы і арганізацыі, якія знаходзяцца на дзяржаўным ці мясцовым бюджэце.

2. Папярэдзіць, што ў выпадку непрадстаўленьня каштарысаў да паказанага тэрміну да неакуратных устаноў і арганізацый будуць праз банк ужыты меры крэдытнага ўзьдзейнічаньня.

3. Абавязаць фінгрупу ЦКК-РСІ, пад адказнасьць тав. КАСЬЦЮКОВІЧА, да 5-II—33 г. скончыць разгляд і зацьверджаньне каштарысаў.

4. Гэту пастанову апублікаваць у друку.

Нам. Наркома РСІ Бел.
ГУРЭВІЧ Н.

Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі азэт-арганізацый

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК БССР

1. Прэзыдыум ЦВК БССР адзначае, што справаздачна-перавыбарчая кампанія азэт-арганізацый мае вялікае палітычнае значэньне ў справе мабілізацыі шырокай пралетарскай грамадзкасьці вакол правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі і вырашэньня задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у галіне завяршэньня працэсу ўцягненьня яўрэйскіх працоўных ў вытворчую працу і ў будаўніцтва сацыялістычнага Біра-Біджану.

2. Асноўнымі практычнымі задачамі справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінны быць: замацаваньне ўсёй азэт-арганізацыі і асноўнага зьвяна—низавой азэт-ячэйкі на прадпрыемстве, у саўгасе і калгасе; разгортваньне інтэрнацыянальнай масава-выхаваўчай работы; стварэньне шырокага актыву; рост арганізацыі і шырокае ўцягненьне у рады АЗЭТ працоўных розных нацыянальнасьцяй; узмацненьне работы па перасяленьні і рэалізацыі пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР аб шэфстве над Біра-Біджанам; стварэньне матэрыяльнай базы для азэт-арганізацый.

3. Прапанаваць райвыканкомам, гарсаветам, райнацкамісіям і сельсаветам аказаць дапамогу азэт-арганізацыям у правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі; у час кампаніі заслухаць даклады аб дзейнасьці азэт-арганізацый і пляны правядзеньня кампаніі, правесьці праверку выкананьня пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР аб шэфстве над Біра-Біджанам.

4. Улічваючы асабліва важнае значэньне пасьпяховага правядзеньня азэт-лётарэі, накіраванай на ўмацаваньне фінансавай базы падшэфнага БССР раёну—Біра-Біджану, скарыстаць справаздачна-перавыбарчую кампанію для стопроцантнай рэалізацыі білетаў па 4-й азэт-лётарэі і падрыхтоўцы да правядзеньня 5-й азэт-лётарэі.

5. Прапанаваць цэнтральнаму і раённаму друку шырока асьвятляць ход справаздачна-перавыбарчай кампаніі азэт-арганізацый.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Вык. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага камітэту БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

29-га лістапада 1932 г.
г. Менск.

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

пра назначэньне тав. Кальтмана С. С. нам. дырэктара Белдзяржсналбу

Эканамічны Савет БССР *пастанаўляе* назначыць т. *Кальтмана С. С.* Намесьнікам Дырэктара Белдзяржснабу.

Старшыня СНК і Эканамічнага Савету БССР
М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў СНК і Эканомсавету БССР
Ф. Сулкоўскі.

Пастанова ЦВК і СНК БССР

пра скасаваньне п. „ж" і зьмену п. п. „з" і „і" арт. 7 палажэньня пра сельскія і местачковыя суды

У адпаведнасьці з пастановай прэзыдыуму ЦВК СССР ад 7-га сьнежня 1932 г. «Пра зьмену пастановы прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР за 17-е красавіка 1932 г. аб сельскіх грамадзкіх судох» (З. З. СССР 1932 г. № 82, арт. 503). Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастаноўляюць:

1. Пункт «ж» арт. 7 палажэньня «Пра сельскія і местачковыя суды» (З. З. БССР 1932 г. № 45 паст. 201) скасаваць:

2. П. П. «з» і «і» арт. 7 памянёнага Палажэньня запісаць у наступнай рэдакцыі:

3. Справы аб крадзяжы асабовай (неграмаджанай) маёмасьці калгасьнікаў і аднаасобнікаў на суму да 50 руб., калі крадзеж зроблен данай асобай упяршыню;

і) справы аб наўмысным зьнішчэньні або пашкоджаньні асабовай (неграмаджанай) маёмасьці калгасьнікаў і аднаасобнікаў, калі разьмер зробленай страты не перавышае 50 руб».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР Г. ГРЫСЕВІЧ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену п. „б" арт. 2 і пра скасаваньне арт. 4 пастановы пра скарыстаньне рабочых коняй на працоўнай гужавой павіннасьці

Савет Народных Камісараў БССР *пастанаўляе* ўнесьці наступныя зьмены ў сваю пастанову за 10 студзеня 1933 г. «Пра скарыстаньне рабочых коней на працоўнай гужавой павіннасьці» (Апубл. у газ. «Савецкая Беларусь» № 13 за 15 студзеня 1933 г.).

1. Запісаць абзац 1 п. «б» арт. 2 у наступнай рэдакцыі:

«б) забараняецца перагружаць коней на рабоце. Сярэднюю норму нагрузкі на 1 падводу ўстанавіць: на аднаконны воз 4 цэнтнера грузу пры калёснай возцы і 5 цэнтнэраў пры саннай возцы і адпаведна на параконны 7 і 8½ цэнтнэраў.

2. Скасаваць арт. 4.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР
Г. Грысевіч.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
Ф. Сулкоўскі.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 г. дня
Ад 25 студзеня замежны мастацкі фільм
СКРЫПАЧ З ФЛЁРЭНЦЫІ
Звыш праграмы хроніка Саюзкіно

САЧЭЦЕ ЗА ТЫРАЖОМ
4-й усебеларускай Азэт-лётарэі
29 і 30 студзеня 1933 г. у Менску, у памяшканьні Яўрэйскага дзяржаўнага тэатру (вул. Валадарскага, 7) АДБУДЗЕЦЦА тыраж IV-й усесаюзнай Азэт-лётарэі.
Афіцыйныя табліцы тыражу будуць апублікаваны ў газэце «Известия ЦИК СССР» і «Савецкая Беларусь».
Урачыстае адкрыцьцё тыражу адбудзецца 29-га студзеня а 5 гадз. увечары. Пасьля адкрыцьця адбудзецца вялікі інтэрнацыянальны канцэрт.
30-І г. г. тыраж вытвараецца з 10 гадз. раніцы на працягу ўсяго дня. Увечары будзе паставлены спэктакль Яўрэйск. дзяржаўным тэатрам «АБЕЧАЯ КРЫНІЦА».
Білеты на вечары 29 і 30 можна атрымаць у ячэйках Азэт, прадпрыемстваў і ўстаноў і ў Менэзат'е (Плян Волі, 13).
Уваход 30 увесь дзень вольны
УСЕ НА ТЫРАЖ!

МЕНСКАЯ АТС
даводзіць да ведама ўсіх абанэнтаў,
што ў бліжэйшыя дні старая тэлефонная станцыя
ЗАКРЫВАЕЦЦА
АПАРАТЫ АПОШНЯЙ БУДУЦЬ ЗЬНЯТЫ
У трохдзённы тэрмін паведамеце АТС (вул. Ка ла Маркса, 10)
у каго ў замен існуючых яшчэ не ўстаноўлены аўтаматычныя тэлефоны або ўстаноўлены, але не працуюць.
Старыя апараты здавайце мавцёрам пад расьпіску, патрабуючы пасьведчаньне.
За ніздачу будзе спагнанада кошт у трайным разьмеры.
Дырэкцыя АТС

1-шы дзяржаўны піваварны завод „БЕЛАРУСЬ"
ПРАПАНУЕ
ўсім сваім пакупнікам як аднагародзім, так і іншагародзім да **15 лютага г. г. зьвярнуць** заводу на зданьне медныя балёны для газаванай вады, бочкі піўныя і квасныя, абсталяваньне, прылады ды інш. маемасьць і напераджае, што пасьля сканчэньня гэтага тэрміну, апрача спагнаньня кошту здзяўчаваў маемасьці ў пяцікратным разьмеры, вінаватыя ў незаконе будуць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці.
Дырэкцыя.

Беларуская кантора Прамбанку
даводзіць да ведама ўсіх сваіх
кліентаў,
што ўперад для атрыманьня зарплаты неабходна ў абавязковым парадку ПРАДСТАЎЛЯЦЬ:
1. Касавы плян на квартал у разрэзе кожнага месяца з паказаньнем тэрміну выдачы зарплаты ўстаноўленых колумовамі.
2. Асобую заведку аб фондзе зарплаты, зацьверджаную НКП.
3. Не пазьней, як за тры дні да выдачы зарплаты плацежную ведамасьць.
4. Пры прадстаўленьні пляну на кожны наступны месяц, прадстаўляць зьвесткі аб фактычных выдатках па фондзе зарплаты, уключаючы яе выплату наяўнымі, так і усе ўтрыманьні.
Касплаты квартальныя і месячныя прадстаўляюцца не пазьней 20 числа кожнага прадпланаванага месяца. Тым кліентам, якія не прадставяць у тэрмін касавыя пляны і не выказваюць адну з вышэйпералічаных умоў, будзе спынена выдача сродкаў.
Белкантора Прамбанку

АБВЯШЧЭНЬНЕ
МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА ФІНАНСАВАГА АДДЗЕЛУ
1 студзеня 1933 году.
1. У мэтах больш дакладнага ўліку зямельных вучасткаў для абкладаньня ЗЯМЕЛЬНАЙ РЭНТАЙ 1933 г. усе юрыдычныя і фізычныя асобы (апрача жактаў), якія знаходзяцца ў Менску і ў непасрэдным карыстаньні якіх або ўладаньні знаходзяцца зямельныя вучасткі і будынкі, павінны падаць у канцэлярыю Гарфінаддзелу ВЕСТКІ аб зьменах, вытвораных у складзе зямельных вучастк у або будынкаў супроць тых заяў, якія былі паданы пры агульнай рэгістрацыі зямлі або ў мінулым годзе. Асобы, установы і арганізацыі, якія па якіх небудзь прычынах зусім не рэгістравалі сваіх зямель і будынкаў у ГАРФА—абавязаны падаць весткі па ўстаноўленай форме з прадстаўленьнем дакумантаў на права ўладаньня або пляну зямельных вучасткаў.
Фізычныя і юрыдычныя асобы, рэгістраваўшыя свае зямельныя вучасткі і будынкі, у якіх ня было ніякіх зьмен супроць даных мінулага году — ад НАДАЧЫ ВЕСТАК у ГЭТЫМ ГОДЗЕ ВЫЗВАЛЯЮЦЦА.
2. Пра ільготы па зямельнай рэнце
Для больш поўнага і своечасовага прадстаўленьня ільгот па зямельнай рэнце вайскова-служачым РСЧА і Ф. і іх семьям, рабочым і служачым, утрыманцам Сабеву і страхкасы, у карыстаньні якіх знаходзяцца зямельныя вучасткі і будынкі,—зацікаўленыя асобы павінны падаць у канцэлярыю Гарфінаддзелу заявы на ўстаноўленай форме з прадстаўленьнем дакумантаў у пацьвярджэньне сваіх праў на ільготу.
Тэрмін падачы заяў па ўліку зьмен у складзе зямельных вучасткаў і па зямельнай рэнце — 20 лютага 1933 г.
Бланкі заяў можна атрымаць у Гарфінаддзеле.
МЕНГАРФА.

Згубленую візу на праезд у Заслаўскую пагранпаласу на імя Т. Н. Цермакевіч. Лічыць страціўшай моц

Членскі білет, выданы саюзам будаўнікоў на імя Міхайлаўскі Г. Я., квіт № 1083

Матрычны выпіс, выд. Менскім загсам на імя Песіна Р. І., квіт 666

Матрычны выпіс, выд. Менскім загсам на імя Трыгубовіч Г. Ф., кв. 667

Мат